К числу важнейших научных направлений кафедры библиотековедения и библиографии отнесены научно-методические рекомендации и теоретико-методологические обобщения по следующим направлениям библиотечно-информационной деятельности: приоритетные направления библиотечно-информационной деятельности библиотек РД; развитие образовательной деятельности библиотек как центров диалога культур народов РФ; повышение роли библиотек в системе поликультурного образования.

---

*1.* Активные пропагандисты идей коммунизма: [С республиканского съезда библиотечных работников] // Дагестанская правда. – 1962. – 25 мая.

*2. Кичев, М.* Дагестан за годы Советской власти (хроника) / М. Кичев, М. Бутаев. – Махачкала : Даг. кн. изд-во, 1963. – 159 с.

*3.* Университет обновленного края. – Махачкала : Даг. кн. изд-во, 1981. – 344 с.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

**Н. А. Ляйко,** *прафесар кафедры інфармацыйных рэсурсаў, кандыдат гістарычных навук, дацэнт;*
**А. І. Фядорына,** *дацэнт кафедры інфармацыйных рэсурсаў,*
*Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў*

## КАТАЛАГІЗАЦЫЯ ДАКУМЕНТАЎ: АСАБЛІВАСЦІ СТРУКТУРЫ Ў АДУКАЦЫЙНЫМ АСЯРОДДЗІ

Пры падрыхтоўцы і перападрыхтоўцы кадраў бібліятэчна-інфармацыйнай сферы на ўсіх этапах адной з дысцыплін бібліятэказнаўчага цыкла з'яўляецца курс «Каталагізацыя дакументаў», які, у адпаведнасці з адукацыйным стартартам, адносіцца да блоку спецыяльных дысцыплін. Да назвы дадзенай дысцыпліны навукоўцы ставяцца неадназначна. Аб гэтым сведчыць тое, што на працягу свайго існавання курс неаднаразова мяняў яе. Найбольш шырокавядомымі назвамі з'яўляюцца «Бібліятэчныя каталогі», «Бібліятэчныя фонды і бібліятэчныя каталогі». Дадзеныя дысцыпліны непасрэдна звязаны паміж сабой, таму што эфектыўнасць выкарыстання бібліятэчных фондаў і задавальненне запытаў карыстальнікаў інфармацыі залежыць ад якаснага стану бібліятэчных каталогаў, кваліфікацыі супра-

цоўнікаў бібліятэк і ўзроўню бібліятэчна-бібліяграфічнай падрыхтоўкі карыстальнікаў інфармацыі. Гэта сведчыць аб тым, што бібліятэчныя каталогі з'яўляюцца асноўнымі носьбітамі інфармацыі ў бібліятэках.

Падрыхтоўка спецыялістаў з сярэдняй спецыяльнай адукацыяй у бібліятэчных тэхнікумах і каледжах ажыццяўляецца з дапамогай інтэграванага курса «Бібліятэчныя фонды і каталогі». Аб структуры курса і яго змястоўным напаўненні дакладнае ўяўленне мы можам атрымаць пры азнаямленні з падручнікам К. Л. Варанько [3], а ў Рэспубліцы Беларусь з праграмы і зборніка тэкстаў лекцый для навучэнцаў Магілёўскага бібліятэчнга каледжа імя А. С. Пушкіна «Арганізацыя бібліятэчных фондаў і каталогаў» [1]. У сярэдніх спецыяльных установах назва гэтага курса захоўваецца і цяпер.

У Беларускім дзяржаўным універсітэце культуры і мастацтваў дадзеная дысцыпліна першапачаткова мела назву «Бібліятэчныя каталогі» і выкладалася са стварэння бібліятэчнага факультэта і да пачатку дзевяностых гадоў XX стагоддзя. У гэтым курсе ажыццяўлялася вывучэнне тэхналагічных працэсаў апрацоўкі дакументаў (фарміраванне бібліяграфічнага апісання, сістэматызацыя, прадметызацыя дакументаў) і арганізацыя бібліятэчных каталогаў.

У канцы васьмідзясятых – пачатку дзевяностых гадоў XX стагоддзя пачалася дыскусія сярод спецыялістаў – тэарэтыкаў бібліятэказнаўцаў і бібліёграфаў аб перспектывах выкладання курса, аб яго рэарганізацыі (Л. У. Сазонава, Г. І. Чыжкова) [7], далучэння бібліятэчных каталогаў да інтэграванага курса «Библиографическое описание документа в библиотеке» (А. П. Коршунаў) [5], змене назвы курса, яго напаўненні (В. П. Палянаў [6], Ю. М. Сталяроў [9]) і інш. Усё гэта знайшло адбітак у тыпавых і вучэбных планах факультэта інфармацыйна-дакументных камунікацый Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта культуры і мастацтваў. Курс «Бібліятэчныя каталогі» быў перайменаваны ў «Аналітыка-сінтэтычную апрацоўку дакументаў». У змест дысцыпліны былі ўнесены адпаведныя змены і дапаўненні. Яна ўключала наступныя раздзелы: бібліяграфічнае апісанне, сістэматызацыю, прадметызацыю дакументаў, арганізацыю, вядзенне і рэдагаванне каталогаў. Але прааналізаваўшы гэтыя дзве назвы і іх напаўненне з пункту гледжання бібліятэчных працэсаў, прыйшлі да высновы, што апошняя не

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

адпавядае структуры курса. Курс «Бібліятэчныя каталогі» ўключае тэхналагічныя працэсы апрацоўкі дакументаў і арганізацыі каталогаў, а вынікам «Аналітыка-сінтэтычнай апрацоўкі дакументаў» з'яўляецца перапрацаваная інфармацыя, якая можа выкарыстоўвацца ў розных відах: каталожных і анатаваных картках, рэфератыўных часопісах, рэфератыўных зборніках, экспрэс-інфармацыі і інш. Асноўнымі працэсамі аналітыка-сінтэтычнай апрацоўкі дакументаў з'яўляюцца: бібліяграфічнае апісанне дакументаў, індэксаванне (сістэматызацыя і прадметызацыя), анатаванне і рэферыраванне дакументаў. Прааналізаваўшы гэтыя назвы і ўлічыўшы змены, якія адбыліся ў галіне каталагізацыі дакументаў у бібліятэках, прыйшлі да высновы, што неправамерна так называць комплексную дысцыпліну, якая вывучае не толькі тэхналагічныя працэсы, але і арганізацыю, вядзенне і выкарыстанне бібліятэчных каталогаў.

Паняцце «Аналітыка-сінтэтычная апрацоўка дакументаў», з аднаго боку, шырэйшае, таму што яно, акрамя асноўных тэхналагічных працэсаў уключае яшчэ анатаванне і рэферыраванне дакументаў. З другога боку, яно не прадугледжвае працэсаў, звязаных з арганізацыяй бібліятэчных каталогаў.

Зыходзячы з гэтага, было вырашана назваць курс «Каталагізацыя дакументаў», які найбольш адпавядае патрабаванням яго структуры. У СТБ ГОСТ 7.76-2004 «Камплектаванне фонда дакументаў. Бібліяграфаванне. Каталагізацыя. Тэрміны і азначэнні» тэрмін «каталагізацыя дакументаў» разглядаецца як «сукупнасць працэсаў, якія забяспечваюць стварэнне і функцыянаванне бібліятэчных каталогаў» [8]. У тэрміналагічным слоўніку «Библиотечное дело. Термины и определения» больш поўна раскрыта гэтае паняцце: у ім падкрэсліваецца, што «Каталогизация – совокупность процессов, обеспечивающих создание и функционирование библиотечных каталогов. Включает формирование библиографической записи (составление библиографического описания, систематизацию, предметизацию), ввод данных в автоматизированную библиотечную систему (или тиражирование каталожных карточек), работу с каталогами, организацию, ведение, редактирование библиотечных каталогов в различных формах, а также управление системой каталогов и технологическими процессами каталогизации» [2, с. 28].

Такім чынам, аналіз тэрміна «каталагізацыя дакументаў», прыведзенага ў СТБ ГОСТ 7.76-2004 і ў тэрміналагічным слоў-

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

ніку, адпавядаюць прызначэнню як традыцыйнай, так і машыначытальнай каталагізацыі.

Курс «Каталагізацыя дакументаў» у пэўныя перыяды для паглыблення ведаў студэнтаў з улікам іх спецыялізацый дапаўняўся наступнымі дысцыплінамі: «Сістэматызацыя дзіцячай літаратуры», «Сучасныя праблемы каталагізацыі», «Сістэматызацыя тэхнічнай літаратуры па УДК», «Індэксаванне літаратуры па УДК», «Сістэматызацыя мастацкай літаратуры».

На факультэце дадатковай адукацыі Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта культуры і мастацтваў выкладаецца курс «Аналітыка-сінтэтычная апрацоўка дакументаў». У адпаведнасці з патрабаваннямі часу ён дапаўняецца дысцыплінай «Электронная каталагізацыя». Нам ўяўляецца, што на сучасным этапе гэта прымальны варыянт для падрыхтоўкі спецыялістаў бібліятэчна-інфармацыйнай сферы з вышэйшай адукацыяй.

Выкарыстанне сучасных адукацыйных тэхналогій пры выкладанні курса «Каталагізацыя дакументаў», яго інфармацыйнае і метадычнае забеспячэнне садзейнічаюць засваенню студэнтамі тэарэтычных і практычных ведаў у апрацоўцы інфармацыйных рэсурсаў і фарміраванні традыцыйных і машыначытальных інфармацыйна-пошукавых сістэм.

Для ўдасканалення падрыхтоўкі студэнтаў па курсе «Каталагізацыя дакументаў» мэтазгодна:

– вывучэнне курса «Каталагізацыя дакументаў» дапоўніць вучэбнай дысцыплінай «Электронная каталагізацыя»;

– у групах студэнтаў, якія маюць сярэднюю спецыяльную адукацыю больш увагі надаваць вывучэнню класіфікацыйных інфармацыйна-пошукавых моў (УДК і ДРНТІ);

– укараняць інавацыйныя формы і метады навучання; павышаць вучэбную матывацыю і фарміраванне ў студэнтаў уменняў і навыкаў выкарыстання сучасных тэхналогій апрацоўкі дакументаў.

---

*1.* Арганізацыя бібліятэчных фондаў і каталогаў: зб. тэкстаў лекцый для навучэнцаў дзённага і завочнага аддзяленняў / Л. Д. Забусава, [і інш.] ; Магілёўскі дзяржаўны бібліятэчны тэхнікум імя А. С. Пушкіна. – Магілёў, 2004. – 289 с.

*2* . Библиотечное дело: терминолог. словарь / РГБ. – 3-е значит перераб. и доп. изд. – М., 1997. – 168 с.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

3. *Воронько, К. Л.* Организация библиотечных фондов и каталогов: учебник для библ. техникумов и библ. отделений культ. – просвет. училищ / К. Л. Воронько. – 2-е изд., перераб. и доп. – М. : Книга, 1981. – 328 с.

4. *Герасимова, Л. Н.* Интегративные тенденции в библиотечном образовании и курс “Библиотечные каталоги” / Л. Н. Герасимова // Совершенствование преподавания курсов «Библиотечные фонды» и «Библиотечные каталоги»: межвуз. сб. науч. тр. – М., 1991. – С. 6–27.

5. *Коршунов, О. П.* О соотношении библиотечного дела и библиографии, библиотековедения и библиографоведения / О. П. Коршунов // Сов.библиогр. – 1982. – № 4. – С. 46–51.

6. *Полянов, В. П.* Быть или не быть «Библиотечному каталоговедению»? / В. П. Полянов // Науч. и техн. б-ки. – 2002. – №10. – С.25–33.

7. *Сазонова, Л. И.* Курс «Библиотечные каталоги»: состояние и перспективы развития / Л. И. Сазанова, Г. И. Чижкова // Формирование библиотечных фондов и организация каталогов на современном этапе: межвуз. сб. науч. тр. – М., 1986. – С. 134–142.

8. СТБ ГОСТ 7.76-2004. Камплектаванне фонду дакументаў. Бібліяграфаванне. Каталагізацыя. Тэрміны і азначэнні = Комплектование фонда документов. Библиографирование. Каталогизация. Термины и определения. – Уведз. 01.03.2005. – Мінск, 2004. – 47 с.

9. *Столяров, Ю. Н.* Библиотековедение, библиографоведение и книговедение как научная специальность : полный курс лекций для аспирантов и соискателей по типовой программе канд.экзамена: учеб. пособие для аспирантов и соискателей по специальности 05.25.03 Библиотековедение, библиографоведение и книговедение / Ю. Н. Столяров. – Орел, 2007. – 266 с.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

**С. А. Паўлава,** *прафесар кафедры менеджменту інфармацыйна-дакументнай сферы, кандыдат філалагічных навук, дацэнт, Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў*

# КІРАВАННЕ АДУКАЦЫЙНЫМ ПРАЦЭСАМ: СІСТЭМНА-ДЗЕЙСНЫ ПАДЫХОД

Перспектывы развіцця бібліятэчнай адукацыі вызначаюцца прынцыпова новымі задачамі, якія стаяць перад цывілізацыяй і грамадзянскім грамадствам XXI стагоддзя: пошук прынцыпова новых крыніц энергіі, адаптацыя да экалагічных крызісаў, выхаванне і самавыхаванне асобы на ўсіх этапах жыццёвага шляху, ранняе развіццё прафесіяналізму і прафесіянальнай мабільнасці.

Трансляцыя і аднаўленне духоўнай спадчыны педагагічнай сферы арганічна дапаўняецца інавацыйным складнікам. У пе-